рэальных гістарычных асоб, а таксама адпаведнасць сэнсавай нагрузкі і формы найменняў герояў словаўтваральным тыпам і мадэлям антрапонімаў адпаведнага гістарычнага перыяду. Значнае месца ў анамастычнай прасторы твораў займаюць «фонавыя» онімы – айконімы, гідронімы, эклезіёнімы і інш. Пры гэтым пісьменнік паспяхова выкарыстоўвае прыём актуалізацыі этымалагічнага значэння насычаных нацыянальна-культурнай інфармацыяй онімаў розных разрадаў.

**Літаратура**

Бензярук, А. Наш край – Жабінкаўшчына: дапаможнік па гісторыі Беларусі.– Брэст: Брэсцкая друкарня, 1996.– 109 с.

УДК 655.5

Н. В. Заяц, дацэнт, канд. філал. навук
(БДПУ, г. Мінск)

## ЛАГІЧНА-СЭНСАВЫ АНАЛІЗ ТЭКСТУ: ФАРМІРАВАННЕ НАВЫКАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНА А. МРЫЯ «ЗАПІСКІ САМСОНА САМАСУЯ»)

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт – адзіная ВНУ нашай краіны, дзе ажыццяўляецца падрыхтоўка рэдактараў-тэхнолагаў. Комплекс прафесійных кампетэнцый будучага рэдактара фарміруецца ў працэсе навучання праз адпаведныя вучэбныя дысцыпліны, сярод якіх важнае месца займае «Рэдактарская падрыхтоўка літаратурна-мастацкіх выданняў». Дысцыпліна накіравана на перадачу неабходных спецыялісту тэарэтычных ведаў, фарміраванне адпаведных уменняў і навыкаў: «Рэдактар павінен ведаць <...> спецыфіку мастацкіх твораў розных жанраў, многія літаратуразнаўчыя тэрміны, валодаць мастацкім густам, каб ацэньваць мастацкую каштоўнасць твораў і прафесійна размаўляць з аўтарамі, дэманструючы разуменне іх творчасці» [3, с. 3].

Выхаванню мастацкага густу, выпрацоўцы рэдактарскай пільнасці, чуйнасці да слова, увагі да розных узроўнях тэксту – моўна-стылявога, сінтаксічнага, лагічна-сэнсавага – садзейнічае разгляд як недасканалых у мастацкіх адносінах прыкладаў, так і хрэстаматыйных твораў высокага гатунку. У прыватнасці,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаёмства з лагічна-сэнсавым аспектам рэдактарскай работы мэтазгодна арганізаваць на матэрыяле рамана А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя», у якім аўтар віртуозна карыстаецца алагізмамі.

Першым этапам работы можа стаць актуалізацыя звестак пра асаблівасці лагічнай арганізацыі твора, сутнасць асноўных законаў логікі.

1. ***Закон тоеснасці***: кожная думка ў працэсе разважання павінна мець адзін і той жа ўстойлівы змест. Прадмет думкі не павінен змяняцца ў ходзе размовы, а паняцці падмяняцца і змешвацца.

2. ***Закон супярэчнасці***: дзве супрацьлеглыя думкі пра адзін і той жа прадмет не могуць быць адначасова сапраўднымі. У тэксце не павінна быць палажэнняў, у якіх адмаўляецца тое, што сцвярджаецца ў іншых.

3. ***Закон выключанага трэцяга:*** з двух супрацьлеглых выказванняў адно абавязкова сапраўднае, трэцяга быць не можа. Следаванне яму забяспечвае звязнасць і несупярэчлівасць думкі.

4. ***Закон дастатковага абгрунтавання***: усякая думка павінна быць абгрунтавана іншымі, сапраўднасць якіх даказана. Трэба, каб у выказванні думкі былі звязаны паміж сабой, вынікалі адна з адной, а іх сапраўднасць пацвярджалася надзейнымі доказамі.

Наступны этап – праца з мастацкім тэкстам. Студэнты зачытваюць урыўкі з рамана і выконваюць заданне: вызначаюць, які з законаў фармальнай логікі парушаны ў кожным з фрагментаў.

1. *Да мяне, як да начальства, з другога боку прысела настаўніца Крутарожка і пачала захапляцца сённяшнім сонечным днём, лесам, пахам чарэмхі, курганамі, блакітнымі кветкамі, мятлушкамі і іншымі сараканожкамі* [1, с. 56].

2. *Першая ўстанова, што я наведаў, было прафбюро. Я пазнаёміўся з старшынёй бюро т. Міленкам і яго тэхнічнай сакратаркай т. Беленькай. У яго ружовае аблічча, зграбна пашыты піджак, чырвоная шаўковая хустачка ў грудным кішэні, перапялёсы гальштучак, усе зубы ў роце і ціхая ласкавая, журчлівая гаворка* [1, с. 61].

3. *Па дадзеных мясцовай статыстыкі, такіх сабак было не менш 73 асоб – лічба ў нашых умовах жудасная* [1, с. 73].

4. *Толькі аднаго я не прадбачыў. Калі ў стратэгічным захапленні я бег па Бальнічнай вуліцы, дык каля мундома № 5 на*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*мяне накінулася нейкая жоўтая сучэнцыя і, ні слова не кажучы, пачала шкумардзіць мае зусім яшчэ новыя штаны* [1, с. 74].

5. *Дарагая! Мениш слёз і стогнаў сэрца! Не адна вы! Цяпер мужчынскае зладзейства бязмежна, і адзіны сродак ёсць для абясшкоджвання распуснікаў – гэта суд. Скарыстайце яго на ўсе 100 проц.! Цяпер, т. Надзея, не верце мужчыну, калі ён клянецца, хоць ком зямлі глынець з яйцо, як перасцерагае ўсіх жанчын пясняр Гарачы ў сваёй паэме «Кроў і зялеза». Праўда, скажу вам, т. Надзея, што паэма гэта цяпер не актуальна. Яна напісана з эпохі, калі, як вам добра вядома, за фунт шчавелю плацілі мільён. Цяпер для нас гэта – ужо пройдзены шлях!..* [1, с. 85].

6. *Ніяк не маглі прыйсці да згоды. Тут нават у мяне з Мамонам ледзьве не склалася разрыўная сітуацыя. Ён настойваў:*

– *Газету трэба назваць «Чырвоная пуга», бо яна будзе несвядомых падганяць да сацыялізму.*

*Дусік уносіў прапанову назваць газету «Чырвонае шапялёўскае вока».*

*Торба хацеў назваць «Гостры чырвоны зуб».*

*А я даваў самую кароткую, яскравую назву – «Пераможны кліч Шапялёўскага райвыканкома»* [1, с. 112].

7. *У Акадэмію навук я паслаў тры трактаты. Першы трактат аб вугалі ў Шапялёўскім раёне. Тут я падрабязна высвятляю:*

– *У раёне ёсць жоўты вугаль (сонца), белы вугаль (вада), блакітны вугаль (вецер), як аснова для заснавання грандыёзнага ветрабуду, зялёны вугаль (торф) і чырвоны вугаль (чалавек, жывёла). Пільныя доследы ў раёне праводзяцца ў мэтах адшукання чорнага вугалю, якога покуль што не ўдалося выкрыць* [1, с. 117].

8. *Другі трактат вырашаў вельмі важнае ў нашых умовах пытанне «Аб фактарах, якія рэгулююць навучальны год у раёне». Я прызнаў, што галоўны фактар – свіння. Як толькі кінуць гэту звярыну ганяць у поле, тады пачынаецца вясковы навучальны год. Практычны вывад: нацыяналізаваць усіх свіней БССР. У гэтым трактаце я зачапіў яшчэ тры пытанні, звязаныя з першым: аб простых спосабах праверкі наліччa фармальных навыкаў у вучняў, аб устанаўленні працэнту ахаплення школай дзяцей вучнёўскага ўзросту і аб стане беларусізацыі школ. Я раіў адказным працаўнікам, якія зацікавяцца гэтымі пытаннямі, уязджаючы ў вёску, пільную ўвагу звяртаць на тое, ці на ўсіх варотах крэйдаю накрамзолены*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*вядомыя ўсім непрыстойныя словы і лаянка і ці сустракаецца ў іх «ў» заместа звычайнага. Калі вы атрымаеце станоўчыя вынікі, дык, не марудзячы ні хвіліны, вы, як даследчык, маеце права зрабіць вывад: 1) фармальныя навыкі ёсць (калі можна разабраць, што напісана), 2) усе дзеці ахоплены школай (калі на ўсіх варотах) і 3) беларусізацыя праходзіць здавальняюча (калі, хоць і рэдка, сустракаецца «ў»)* [1, с. 117–118].

На заключным этапе студэнты абгрунтоўваюць мэтазгоднасць ужывання алагізмаў, вызначаюць функцыянальную нагрузку наўмысных лагічна-сэнсавых памылак у рамане (маўленчая характарыстыка персанажа, стварэнне камічнага эфекту).

Вопыт паказвае, што займальны характар практыкаванняў садзейнічае эфектыўнаму засваенню вучэбнага матэрыялу, фарміраванню навыкаў лагічна-сэнсавага аналізу тэксту, надае заняткам неабходную дынаміку, павышае прадуктыўнасць працы.

**Літаратура**


1. Мрый, А. Творы: раман, апавяданні, нататкі / уклад. і прадм. Я. Лецкі.– Мінск: Маст. літ., 1993.– 317 с.
2. Редакторская подготовка литературно-художественных изданий: курс лекций для студентов специальности 1-47 01 01 Издательское дело / сост. Д. П. Зылевич.– Минск: БГТУ, 2014 [Электронный ресурс].– Режим доступа: https://elib.belstu.by/handle/123456789/12072.– Дата доступа: 24.06.2019.



УДК 821.161.3.09 (092)



І. Л. Іконнікава, магістр філал. навук
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)


## ВОБРАЗ МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА

Малая радзіма ў творчасці Георгія Марчука – неад'емная частка прасторы яго твораў. Праз пейзажныя апісанні Давыд-Гарадка (а менавіта гэта мястэчка з'яўляецца месцам нараджэння пісьменніка) і яго мясцінаў, характарыстыку бытавога ўкладу, раскрыццё асаблівасцей псіхалогіі палешукоў, экскурсы ў гісторыю рэгіёна і ствараецца яе трывалы вобраз.

Для большасці людзей малая радзіма – месца, якое асацыіруецца з домам і сям'ёй. Яно навявае настальгічныя ўспаміны, бо з ім звязана памяць дзяцінства. Роднае мястэчка выклікае


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ